# МУЗЕЯЗНАЎСТВА

УДК 069(476-25):[069.01:351.853]

*Ю. В. Кавалёва*

## Дзейнасць Музея гісторыі горада Мінска па музеефікацыі аб'ектаў Верхняга горада

*У артыкуле разглядаюцца пытанні музеефікацыі нерухомых аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны. Апісваецца вопыт работы Музея гісторыі горада Мінска па музеефікацыі аб'ектаў на тэрыторыі Верхняга горада на прыкладзе экспазіцый Мастацкай галерэі Міхаіла Савіцкага, Мінскай гарадской ратушы, Гарадской мастацкай галерэі твораў Л. Д. Шчамялёва, Майстэрні-музея Івана Міско.*

Адной з функцый сучаснага музея з'яўляецца музеефікацыя. Паводле вызначэння Міжнароднага камітэта па музеялогіі пры ІКОМ, «музеефікацыя азначае змяшчэнне ў музей або (у больш шырокім сэнсе) пераўтварэнне ў разнавіднасць музея фрагмента рэальнасці – важнай для характарыстыкі дзейнасці чалавека, альбо прыроднай разнастайнасці» [7, с. 45]. Музеефікацыяй нерухомых гісторыка-культурных аб'ектаў і тэрыторый займаюцца пераважна музеі-запаведнікі і музеі гісторыі гарадоў. Расійскія даследчыкі М. А. Гранстрэм, М. В. Залатарова вызначаюць музеефікацыю і як яе вынік – музеефікаваную зону як асаблівы элемент функцыянальна-прасторавай структуры гістарычнага горада, рэжым якога накіраваны на захаванне і экспанаванне гісторыка-культурнай спадчыны, зыходзячы з «асяроддзевай гісторыі» тэрыторыі, каштоўнасных аспектаў і асаблівасцей матэрыяльна-прасторавых аб'ектаў, якія складаюць яго, а таксама згодна з агульным кантэкстам гістарычнай часткі горада [1].

Тэарэтычныя аспекты музеефікацыі гарадскога асяроддзя закранаюцца ў даследаваннях сучасных расійскіх навукоўцаў А. М. Масцяніцы [8], М. Е. Каўлен [6], англійскага Макса Хебдзіча [11, с. 4–6] і інш. Абапіраючыся на вынікі дадзеных работ, даецца аналіз дзейнасці Музея гісторыі горада Мінска па музеефікацыі аб'ектаў на тэрыторыі Верхняга горада.

За сем гадоў працы Музей гісторыі горада Мінска (2010–2017), выкарыстоўваючы новыя стратэгіі ў галіне праектавання, ствараў му-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

зейныя экспазіцыі ў будынках, звязаных з летапіснымі падзеямі горада. У структуры музея на сённяшні дзень дзевяць падраздзяленняў: Мастацкая галерэя Міхаіла Савіцкага, Гарадская мастацкая галерэя твораў Л. Д. Шчамялёва, Майстэрня-музей народнага мастака Беларусі Івана Міско, Мінская гарадская ратуша, экспазіцыя «Карэтная», Археалагічны музей, Музей «Лошыцкая сядзіба» і прысядзібны флігель у Лошыцкім сядзібна-паркавым комплексе, Арт-гасцёўня «Высокае месца», экспазіцыя «Мінская конная чыгунка». Большасць аб'ектаў знаходзіцца на тэрыторыі Верхняга горада.

Усе пералічаныя экспазіцыі ствараліся ў рамках навуковай канцэпцыі развіцця музея, якая абапіраецца на прынцып музеефікацыі горада, у аснове якога тэндэнцыя злучэння ландшафтных і архітэктурных помнікаў у межах ахоўных зон з мэтай аднаўлення культурна-гістарычнага асяроддзя мінулага.

Дзейнасць Музея гісторыі горада Мінска па музеефікацыі аб'ектаў на тэрыторыі Верхняга горада ўлічвае вопыт аналагічных музеяў гісторыі гарадоў, тэарэтычныя даследаванні расійскіх і еўрапейскіх вучоных, але ў многім з'яўляецца наватарскай і можа служыць прадметам для вывучэння як прыклад сучаснага музея, які ствараецца ў XXI ст.

Пранікненне музея ў гарадское асяроддзе Верхняга горада Мінска ў многім адпавядае тым метадам, якія вылучае даследчыца А. М. Масцяніца [8]:

– ствараюцца філіялы, якія дакументуюць асобныя аспекты жыцця гарадскога арганізма і забяспечваюць музейнае выкарыстанне і інтэрпрэтацыю важных з пункту гледжання гісторыі горада архітэктурных помнікаў і ансамбляў. У дачыненні да Музея гісторыі горада Мінска – гэта такія структурныя падраздзяленні, як Мастацкая галерэя Міхаіла Савіцкага, Гарадская мастацкая галерэя твораў Л. Д. Шчамялёва, узноўлены будынак Мінскай гарадской ратушы, комплекс музеяў на тэрыторыі былога кляштара бернардзінцаў;

– ажыццяўляецца рознаўзроўневая музеефікацыя гарадскога асяроддзя, якая ўключае выяўленне і інтэрпрэтацыю гістарычнай, культурнай, мемарыяльнай каштоўнасці розных аб'ектаў з дапамогай частковай рэканструкцыі. Структурныя падраздзяленні Музея гісторыі горада Мінска знаходзяцца ў будынках, якія былі рэканструяваны пад музейныя будынкі як з улікам патрабаванняў музея, так і зыходзячы з іх першаснага гістарычнага прызначэння;

– шырокае выкарыстанне прасторы горада ў розных відах музейнай дзейнасці. Прыкладам могуць служыць шматлікія мерапрыемствы на прылеглай да музея тэрыторыі, такія як рыцарскія фэсты ў «Карэтным дворыку», выставачныя праекты ў парадным двары Мастацкай галерэі Міхаіла Савіцкага і дворыку па вуліцы Рэвалюцыйнай, 10, культурна-адукацыйны маршрут «Музейны праменад» па музейных аб'ектах Верхняга горада.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Разгледзім больш падрабязна некаторыя напрамкі работы музея па музеефікацыі асобных аб’ектаў Верхняга горада Мінска.

Мастацкая галерэя Міхаіла Савіцкага размяшчаецца на плошчы Свабоды, 15, у будынку былой гарадской сядзібы XVIII ст., які з’яўляецца помнікам архітэктуры, унесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Беларусі, навуковы кіраўнік – архітэктар С. Г. Багласаў.

Першым уладальнікам дома быў падканцлер Вялікага Княства Літоўскага Міхаіл Пшаздзецкі, аб чым захавалася пісьмовае сведчанне ў «Тарыфах падымнага і чапавога збораў па г. Мінску» за 1775 г. – у цэнтры горада на Высокім Рынку ўзгадваецца палац яснавяльможнага пана Пшаздзецкага, падканцлера Вялікага Княства Літоўскага.

2 лютага 1799 г. граф М. Пшаздзецкі прадаў дом за 40 тысяч польскіх злотых Андрэю і Ганне Станкевічам. А. Станкевіч быў вядомым у Мінску аптэкарам, якому 1 кастрычніка 1782 г. граматай караля Сігізмунда Аўгуста было дазволена адкрыць «публічную аптэку для ўсіх жыхароў горада, для паратавання здароўя людскога» [10, с. 5].

У 1826 г. частка сядзібы была набыта ў А. Станкевіча Юрыем Кабылінскім. Ю. Кабылінскі вядомы як сакратар Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу, сябра пісьменніка В. Дуніна-Марцінкевіча, мецэнат і калекцыянер. Яго сядзіба была месцам сустрэч творчай інтэлігенцыі горада. Ю. Кабылінскі стварыў у сядзібе адзін з першых публічных музеяў Мінска, аб чым піша С. Кавалеўская ў выданні «Obrazki Mińskie» (Вільня, 1912). Збор музея складаўся з калекцыі мінералаў, антычных манет, твораў мастацтва, сярод якіх былі работы пэндзля мастака Івана Дамеля [5]. Беларускі калекцыянер, бібліёграф і гісторык літаратуры Р. А. Зямкевіч (1881–1943/44) узгадвае Ю. Кабылінскага як сцюарта (займаўся дабрачыннымі зборамі) масонскай ложы «Паўночная паходня», які вызначаўся глыбокай эрудыцыяй, дасціпнасцю, жывым тэмпераментам, аўтара рукапіснага зборніка жартаў «Тысяча фацэцыяў і адна» [3].

У 1851 г. Ю. Кабылінскі прадаў дом гарадскому галаве Леапольду Дэльпацэ. Вядома, што пры гэтым уладальніку ў сядзібных пабудовах праводзіліся рамонтныя работы. Л. Дэльпацэ прадаў дом Мінскаму мужчынскаму духоўнаму вучылішчу. Класы і жылыя пакоі вучылішча размяшчаліся ў памяшканнях сядзібы з 1872 па 1918 г. У 1870–1880-я гг. была праведзена рэканструкцыя сядзібнага комплексу.

Пасля рэвалюцыі 1917 г. і да нашых дзён у пабудовах сядзібы знаходзіліся разнастайныя дзяржаўныя ўстановы. З 1950-х гг. да 2004 г. тут размяшчаўся Мінскі абласны ваенкамат.

У 2008–2009 гг. распрацаваны праект «Рэканструкцыя з рэстаўрацыяй будынка № 15 на плошчы Свабоды пад мастацкую галерэю з адміністрацыйнымі памяшканнямі». Заказчыкам работ выступіла «Мінская спадчына», генеральным праекціроўшчыкам – прадпрыемства «Мінскграда». Аўтар архітэктурнага праекта – архітэктар В. Я. Яўсееў.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На аснове архітэктурных і гістарычных даследаванняў будынка ААТ «ЦРГКЛіТ» распрацаваны праект аднаўлення фрагментаў жывапіснага дэкору ў інтэр'еры асобных памяшканняў, кафлянай печы, а таксама ўзнаўлення ў экспазіцыі жылых інтэр'ераў канца XVIII–XIX ст. – малой і вялікай гасцёўні, кабінета, бібліятэкі. Аўтары рэканструкцыі – А. М. Кропатаў, Г. П. Басак, В. В. Ракіцкі.

Галерэя была ўрачыста адкрыта ў верасні 2012 г. Асноўная частка экспазіцыі прысвечана М. А. Савіцкаму (1922–2010). Першы паверх галерэі адведзены пад экспазіцыю «Мінск губернскі – дваранскі быт», дзе створаны рэканструкцыі чатырох пакояў былога сядзібнага дома з мэтай захавання і музеефікацыі гісторыі дадзенага помніка архітэктуры як былой гарадской сядзібы. Інтэрпрэтацыю гісторыі сядзібнага дома музей рэалізуе не толькі сродкамі экспазіцыі, але і актыўнай культурна-асветніцкай работай, якая накіравана на папулярызацыю гістарычнага будынка, уключэнне яго ў культурнае жыццё горада, наладжванне камунікацыі паміж музеем і наведвальнікам. Распрацавана тэматычная экскурсія па гістарычнай частцы экспазіцыі, прысвечаная дваранскаму быту канца XVIII–XIX ст., дэкаратыўным элементам афармлення інтэр'ераў гарадской сядзібы – рэканструкцыям і законсерваваным насценным фрэскавым роспісам канца XVIII ст. Станоўчыя водгукі атрымалі масавыя культурна-асветніцкія мерапрыемствы «Запрашэнне на баль» (2012), «Баль-маскарад» (2013), «Ноч адкрыццяў» (2013), «Танцавальная ноч» (2014), прысвечаныя традыцыям свецкіх вечароў Мінска XIX ст.

Адным з найбольш складаных аб'ектаў музея, які патрабуе музеефікацыі, з'яўляецца Мінская гарадская ратуша. Будынак быў пабудаваны на плошчы Свабоды ў 2002–2004 гг. Пачатку работ па рэканструкцыі папярэднічалі гады навуковых даследаванняў гісторыі будаўніцтва ратушы.

Паводле тэксту прывілеі Мінска на Магдэбургскае права, дадзенае гораду вялікім князем літоўскім Аляксандрам Казіміравічам Ягелончыкам у 1499 г., гараджанам прадпісвалася збудаваць ратушу – будынак, дзе будзе збірацца гарадская рада. Месцазнаходжанне ратушы ў пачатку XVI ст. невядома. Першыя дадзеныя аб існаванні ратушы адносяцца да 1582 г., калі адзін з жыхароў маёнтка Гарадзец быў пасаджаны ў ратушную вязніцу. Пачынаючы з XVII ст. ратуша ўзгадваецца як будынак у цэнтры плошчы Верхняга Рынку. Найбольш значныя будаўнічыя работы па рэканструкцыі ратушы адбываліся пасля пажараў 1640 г. і 1744 г. [2, с. 27].

Апошнія змены ў знешнім выглядзе ратушы (яна была разбурана ў 1857 г.) адносяцца да перыяду ўваходжання беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі. Так, у канцы XVIII ст. губернскі архітэктар Ф. Крамер кіраваў работамі па перабудове ратушы. Праектныя чарцяжы дава-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ляюць вызначыць, што ратуша ўяўляла сабой прамавугольны ў плане двухпавярховы будынак з чацверыковай вежай, накрыты вальмавым дахам. Фасады мелі сціплую дэкаратыўную апрацоўку, толькі рызаліт і тарцы былі аформлены порцікамі іанічнага ордэра. Пазней, паміж 1825–1835 гг., бакавыя порцікі ратушы былі завершаны франтонамі [Там жа, с. 28].

Матэрыялы з выявай ратушы да перабудовы не выяўлены, таму менавіта праектныя чарцяжы Ф. Крамера сталі галоўнай крыніцай для архітэктараў і рэстаўратараў пры распрацоўцы праекта рэканструкцыі будынка. Акрамя таго, былі выкарыстаны захаваныя ілюстратыўныя матэрыялы з выявай ратушы: малюнак невядомага мастака пачатку XIX ст., акварэльны малюнак Г. Герасімовіча першай паловы XIX ст., акварэльны малюнак Ю. Пешкі «Від плошчы Верхняга Рынку ў Мінску» XIX ст., гравюра Б. Лаверня «Саборная плошча», 1840 г.

Праект аднаўлення Мінскай ратушы распрацоўваўся пад кіраўніцтвам галоўнага архітэктара С. Багласава, галоўнага канструктара А. Мельнічука і галоўнага архітэктара праекта В. Якавенкі па ініцыятыве і пры фінансаванні Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта. 13 верасня 2002 г., напярэдадні святкавання Дня горада, старшыня Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта М. Паўлаў паклаў першы камень і капсулу са зваротам да нашчадкаў у падмурак Мінскай ратушы.

Мінская ратуша была адноўлена на сваім гістарычным месцы і 11 верасня 2004 г. падчас святкавання Дня горада прыняла першых наведвальнікаў. Афіцыйнае адкрыццё, у якім браў удзел Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка, адбылося 4 лістапада 2004 г.

З 2004 па 2012 г. будынак ратушы выконваў толькі адміністрацыйныя функцыі і, па сутнасці, з'яўляўся закрытым для вольнага доступу аб'ектам.

У 2012 г. ратуша набыла статус структурнага падраздзялення Музея гісторыі горада Мінска і паралельна з адкрыццём летняй музычна-турыстычнай праграмы «Верхні горад» стала даступная наведвальнікам.

Варта адзначыць, што рэалізацыя задачы па стварэнні экспазіцыі і музеефікацыі ратушы ўскладнялася дваякім прызначэннем будынка, які спалучаў у сабе музейныя і адміністрацыйныя функцыі. Галоўнай мэтай будучай экспазіцыі стала адлюстраванне гісторыі горада часоў Магдэбургскага права і гісторыі функцыянавання будынка ў перыяд 1499–1857 гг. і з 2004 г. – да нашых дзён.

На першым этапе створана невялікая экспазіцыя, прысвечаная атрыманню горадам права на самакіраванне. У 2012 г. адкрыта стацыянарная экспазіцыя «Мінск у гістарычнай прасторы. Картаграфічны кабінет», з 2014 г. працуе доўгатэрміновы праект «Мінск сярод сяброў. Гарады-пабрацімы сталіцы Беларусі».

На другім этапе праведзены рамонтныя работы і ў верасні 2017 г. да святкавання 950-гадовага юбілею г. Мінска адноўлены будынак ра-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тушы прыняў першых наведвальнікаў – дэлегацыі ганаровых гасцей з 11 гарадоў-пабрацімаў і 4 гарадоў-партнёраў.

На сённяшні дзень музейная экспазіцыя ратушы складаецца з чатырох тэматычных комплексаў:

1) «Магдэбургскае права ў Мінску» – прысвечана гісторыі гарадскога самакіравання, гарадской сімволікі, развіццю рамесных цэхаў;

2) «Мінскія старажытнасці» – археалагічная экспазіцыя з фондавых калекцый Музея гісторыі горада Мінска і Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Дэманструе асноўныя этапы станаўлення горада з XI ст. да пачатку XIX ст.;

3) «Мінск у гістарычнай прасторы. Картаграфічны кабінет» – адлюстроўвае месца Мінска на геапалітычнай карце Еўропы як адміністрацыйна-тэрытарыяльнага цэнтра Мінскага павета, ваяводства, губерні з сярэдзіны XVI ст. да сярэдзіны XIX ст. Прадстаўлены арыгінальныя карты, копіі і рэпрадукцыі рэдкіх экзэмпляраў, на якіх упершыню абазначаны заселеныя славянамі землі, горад Мінск і яго ваколіцы;

4) «Мінск сярод сяброў. Гарады-пабрацімы сталіцы Беларусі» – дынамічная экспазіцыя, прысвечаная развіццю міжнародных сувязей Мінска. Складаецца з падарункаў гораду ад гарадоў-пабрацімаў і гарадоў-партнёраў.

Акрамя стварэння музейных экспазіцый, музеефікацыя ратушы і інтэрпрэтацыя яе месца ў гарадской гісторыі адбываецца праз культурна-асветніцкія музейныя і агульнагарадскія праграмы. Распрацавана аглядная экскурсія «Мінская ратуша – гісторыя і сучаснасць», традыцыйнымі сталі мерапрыемствы музычна-турыстычнага сезона на ратушнай плошчы – горад майстроў, выступленні рыцарскіх клубаў, вулічныя тэатральныя пастаноўкі, інтэрактыўныя танцавальныя майстар-класы. Сумесна з тураператарам «Віяполь» рэалізуецца праграма «Манюшка сустракае гасцей», дзе асаблівая ўвага нададзена інтэрпрэтацыі гісторыі ратушы XIX ст., калі яна выкарыстоўвалася ў якасці тэатральнага будынка.

Такім чынам, Мінская гарадская ратуша, з аднаго боку, выконвае адміністрацыйныя функцыі і з'яўляецца месцам правядзення разнастайных культурных, навуковых, урачыстых мерапрыемстваў Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта, а з другога боку – перажывае перыяд музеефікацыі праз стварэнне тэматычных экспазіцый і ўключэнне ў культурна-асветніцкую дзейнасць Музея гісторыі горада Мінска.

Сімвалічнае значэнне для Музея гісторыі горада Мінска мае будынак – помнік архітэктуры XIX ст., размешчаны на тэрыторыі Верхняга горада па вуліцы Рэвалюцыйнай, 10. Менавіта тут у 2010 г. была адкрыта першая экспазіцыя музея, знаходзілася адміністрацыя, кабінеты наву-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ковых супрацоўнікаў, фондасховішчы. З 2015 г. у будынку размяшчаецца філіял музея – Гарадская мастацкая галерэя твораў Л. Д. Шчамялёва. Гісторыя галерэі пачалася ў 2003 г., калі яна была адкрыта ў мікрараёне Серабранка. З 2010 г. увайшла ў структуру Музея гісторыі горада Мінска. У 2015 г. адкрылася новая экспазіцыя галерэі ў гістарычным цэнтры Мінска. Акрамя пастаяннай экспазіцыі, прысвечанай народнаму мастаку Беларусі Леаніду Шчамялёву, галерэя мае выставачныя залы для зменных экспазіцый пераважна мінскіх мастакоў.

Будынак галерэі спалучае тры збудаванні – дамы № 6, 8, 10. Дом № 6 пабудаваны ў канцы XIX ст., называўся домам Грушкіна, па прозвішчу свайго ўладальніка. З 1903 г. у доме размяшчалася прыватная лякарня па хваробах зроку С. Камінскага. Была разлічана на 6 койка-месцаў, вёўся амбулаторны прыём хворых. Дом № 8 пабудаваны ў XIX ст., называўся домам Аксельрода. З 1895 г. у доме размяшчалася банкірская кантора, або гандлёвы дом «Г. А. Ліфшыц», які меў аддзяленне ў Лібаве і карыстаўся замежнымі сувязямі. Акрамя гандлю кантора займалася ўлікам вексельных абавязкаў. Дом № 10 пабудаваны ў XIX ст. Галоўны яго фасад упрыгожаны сухарыкамі, стварае ўяўленне невялікага памеру будынка, які на самай справе выцягнуты ўдаўжыню ў бок двара [9, с. 102–111].

У савецкі перыяд гэтыя будынкі выкарыстоўваліся як жылыя і адміністрацыйныя. Рэканструкцыя іх вялася ў 2007–2009 гг. Музей гісторыі горада Мінска доўгі час размяшчаў тут свае доўгатэрміновыя і часовыя экспазіцыі без уліку гісторыі саміх помнікаў архітэктуры. Першая спроба музеефікацыі гісторыі будынка была здзейснена ў 2017 г. праз стварэнне экспазіцыі «Вытокі». Па першапачатковай задумцы экспазіцыя мела часовы характар і была прысвечана творчасці мінскага скульптара А. Шатэрніка, які ў першыя пасляваенныя гады пражываў у доме № 10 па вуліцы Рэвалюцыйнай. У далейшым частка экспазіцыі была трансфармавана і цяпер прадстаўляе сабой рэканструяваны інтэр’ер мінскай кватэры канца 1940 – пачатку 1950-х гг. Мемарыяльная каштоўнасць экспазіцыі абумоўлена складам экспанатаў, частка з якіх перададзена ў фонды музея былымі жыхарамі кватэр па вуліцы Рэвалюцыйнай – Г. Ігнацюк, Л. Мезенцавай, А. Левітман, А. Шатэрнікам. Такім чынам музей атрымаў новы вопыт работы з карэннымі жыхарамі горада Мінска, папоўніў фондавыя калекцыі, рэалізаваў адну са сваіх галоўных задач – музеефікацыя помніка архітэктуры з улікам яго гісторыі і функцыянальнага прызначэння ў мінулым.

Майстэрня-музей народнага мастака Беларусі Івана Міско ўвайшла ў структуру музея ў 2011 г. і знаходзіцца на вуліцы Інтэрнацыянальнай, 11а. Выкарыстоўваецца як працоўнае месца скульптара і выставачная прастора адначасова.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Будынак майстэрні з'яўляецца помнікам архітэктуры XIX ст. Уваходзіў у структуру комплекса езуітаў, якія займалі цэлы квартал Мінска, абмежаваны вуліцамі Рэвалюцыйнай, Інтэрнацыянальнай, Камсамольскай, Леніна. Дакладнае прызначэнне будынка ў XIX ст. невядома. На рэканструяваным плане езуіцкага комплексу другой паловы XVIII ст. сярод гаспадарчых пабудоў можа быць ідэнтыфікаваны як будынак кузні або стайні [4, с. 65].

Майстэрня народнага мастака Беларусі І. Міско знаходзіцца ў будынку з 1970-х гг. Пераўтварэнне майстэрні ў музей з'яўляецца рэдкім выпадкам музеефікацыі рабочага месца скульптара. У майстэрні адсутнічае традыцыйная музейная экспазіцыя, яна, па сутнасці, з'яўляецца «жывым» музеем, дзе наведвальнікі могуць назіраць працэс стварэння твора мастацтва праз непасрэдны кантакт з аўтарам. Экскурсія прадугледжвае магчымасць уключэння ў творчы працэс, атрыманне першасных навыкаў працы з матэрыялам.

Такім чынам, Музей гісторыі горада Мінска развіваецца, абапіраючыся на патрабаванні сучаснага грамадства і актуальныя тэндэнцыі ў музеялогіі. На сённяшні дзень восем з дзевяці структурных падраздзяленняў музея размешчаны на тэрыторыі Верхняга горада і, па сутнасці, утвараюць музейны комплекс. Дзейнасць па музеефікацыі аб'ектаў Верхняга горада заключаецца ва ўсебаковым вывучэнні гісторыі музеефікаваных аб'ектаў з мэтай наступнага стварэння адпаведных экспазіцый і распрацоўкі культурна-асветніцкіх праграм, накіраваных на актуалізацыю гісторыка-культурнай спадчыны горада Мінска.

1. *Гранстрем, М. А.* Музеефикация как политика сохранения объемно-пространственной идентичности фрагментов исторического города / М. А. Гранстрем, М. В. Золоторева // Великие реки – 2016 : [труды науч. конгресса] : в 3 т. / отв. ред. А. А. Лапшин. – Н. Новгород, 2016. – С. 143–146.

2. *Денисов, В. Н.* Площадь Свободы в Минске / В. Н. Денисов. – Минск : Полымя, 1985. – 79 с.

3. *Зямкевіч, Р.* Стары Мінск у беларускіх успамінах / Р. Зямкевіч // Пачынальнікі : з гіст.-літ. матэрыялаў XIX ст. : зб. – Мінск, 2003. – С. 21–37.

4. In Nomine Domini: Мінскі архікатэдральны касцёл Імя Найсвяцейшай Панны Марыі : 300-годдзю кансэкрацыі святыні прысвячаецца. – Мінск : Pro Christo, 2010. – 249 с.

5. *Kowalevska, Zofia.* Ze wspomnień wygnańca / Zofia Kowalevska. – Vilnius : Zawadzki, 1911. – 262 с.

6. *Каулен, М. Е.* Средовой музей в пространстве города / М. Е. Каулен // Молодежь и социум. – Тамбов, 2012. – № 8. – С. 9–18.

7. Ключевые понятия музеологии / сост. A. Desvallees, F. Mairesse ; пер. на рус. яз. А. В. Урядниковой. – М. : Август Борг, 2012. – 101 с.

8. *Мастеница, Е. Н.* Музеефикация городской среды: подходы и методы [Электронный ресурс] / Е. Н. Мастеница // Исторические, философские, политические и юридические науки, культурология и искусствоведение : вопросы теории и практики. – Тамбов : Грамота, 2013. – № 10-1 (36). – С. 137–141. – Режим доступа: http://elibrary.ru/item.asp?id-20363802. – Дата доступа: 10.03.2017.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*9.* Минск. Старый и новый / авт.-сост. В. Г. Воложинский ; под. ред. З. В. Шибеко. – Минск : Харвест, 2007. – 272 с.
*10. Сосонкина, В. Ф.* Исторический очерк развития аптечного дела в Минске с конца XVI до второй половины XX в. (до 1941 г.) / В. Ф. Сосонкина // Новости экспертизы и регистрации. – 2008. – № 6 (42). – С. 4–10.
*11. Хебдич, М.* Музеи – о городах / М. Хебдич // Museum. – 1996. – № 1. – С. 4–6.

*Y. Kovaliova*

**Activities of the Museum of history of Minsk according to museification of the Upper Town objects**

*The museification of the immovable objects of historical and cultural heritage is discussed in the article. It describes the experience of the state institution «Museum of the History of Minsk» on the objects' museification in the Upper Town. It provides the experience of the museum according to the expositions of the Art Gallery by Mikhail Savitsky, Minsk City Hall, City art gallery of works by Leonid Shchemelyov, a Museum-studio of Ivan Misko.*

Дата паступлення артыкула ў рэдакцыю: 28.02.2018.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ